А.М. Аксёнаў

# Этнічная гісторыя беларусаў

# ЭТНАС (ГРЭЧ. – НАРОД) -

ГІСТАРЫЧНА ЎЗНІКШАЯ НА ПЭЎНАЙ ТЭРЫТОРЫІ СУПОЛЬНАСЦЬ ЛЮДЗЕЙ, ЯКІЯ МАЮЦЬ АГУЛЬНУЮ МОВУ, ЗНЕШНІЯ РЫСЫ І МЕНТАЛІТЭТ, АГУЛЬНУЮ МАТЭРЫЯЛЬНУЮ І ДУХОЎНУЮ КУЛЬТУРУ, САМАСВЯДОМАСЦЬ І САМАНАЗВУ.

# Асноўныя рысы (прыкметы) беларускага этнасу:

- мова;
- этнічная самасвядомасць;
- своеасаблівая культура;
- этнічная тэрыторыя;
- асаблівасці псіхічнага складу (характар);
- асаблівыя антрапалагічныя рысы (знешні выгляд);
- саманазва (этнонім).

# СКЛАДАЮЧЫЯ ЧАСТКІ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСАЎ ЯК САМАСТОЙНАГА ЭТНАСА

- Этнагенэз (доўгі па часу працэс фарміравання, станаўлення этнасу (народа) -

прыкладна з 27 тыс. да н.э да сяр. 16 ст.

- Гісторыя этнаса – з сяр. 16 ст. да сучаснасці.

# ЭТАПЫ РАЗВІЦЦЯ ЭТНАСУ:

| I | II | III |
|---|---|---|
| ПЛЯМЁНЫ | НАРОД | НАЦЫЯ |
| ПРЫСВОЙВАЮЧАЯ ГАСПАДАРКА | ВЫТВОРЧАЯ ГАСПАДАРКА | МАШЫННАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ |

(ЭКАНАМІЧНАЯ АСНОВА)

| | | |
|---|---|---|
| ПЕРШАБЫТНА-АБШЧЫННЫ ЛАД | ФЕАДАЛІЗМ | БУРЖУАЗНЫ ЛАД (КАПІТАЛІЗМ) |
| ДА 9 СТ. | 9-СЯР. 19 СТ. | З СЯР. 19 СТ. |

(ГРАМАДСКА – ЭКАНАМІЧНАЯ ФАРМАЦЫЯ)

# БЕЛАРУСКІ ЭТНАС КАНЧАТКОВА СФАРМІРАВАЎСЯ Ў 12 – сяр. 16 СТ.

**у дзяржаве “Вялікае княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае і іншых зямель”, складаў яго аснову, дзяржаўнай мовай ВКЛ была старабеларуская мова, меўшая назву “рускі язык”.**

# Этнічная тэрыторыя беларусаў

супадала з рассяленнем **асноўных старажытных продкаў беларусаў** ( крывічоў, літвы, дрыгавічоў і радзімічаў) і **ўключала землі**

- КРЫВІЦКІЯ (Віцебшчына, Смаленшчына, Невельшчына);
- ГІСТАРЫЧНАЙ ЛІТВЫ (Віленшчына, Гродзеншчына);
- ДРЫГАВІЦКІЯ (Цэнтральная Беларусь, Палессе, Берасцейшчына);
- РАДЗІМІЦКІЯ (Магілёўшчына, Гомельшчына, Заходняя Браншчына).

# Этнічная тэрыторыя -

тэрыторыя капактнага рассялення народа, з якой звязаны яго фарміраванне і развіццё.

У 14-16 ст.тэрыторыя этнічных беларусаў у ВКЛ складала прыкладна 260 тыс.кв.км. Тэрыторыя сучаснай Рэспублікі Беларусь роўная 207,56 тыс.кв.км.

# Этнічная тэрыторыя беларусаў



# СІСТЭМА ЭТНІЧНЫХ СУПОЛЬНАСЦЕЙ СВЕТУ



# МЕТАЭТНАС “СЛАВЯНЕ”

## УСХОДНІЯ СЛАВЯНЕ

БЕЛАРУСЫ

ВЯЛІКАРОСЫ

( АЛЬБО РУСКІЯ)

УКРАІНЦЫ

## ЗАХОДНІЯ СЛАВЯНЕ

ПАЛЯКІ

ЧЭХІ

СЛАВАКІ

КАШУБЫ

ЛУЖЫЧАНЕ

## ПАЎДНЁВЫЯ СЛАВЯНЕ

БАЛГАРЫ

СЕРБЫ

ХАРВАТЫ

БАСНІЙЦЫ

МАКЕДОНЦЫ

СЛАВЕНЦЫ

ЧАРНАГОРЦЫ

Славяне – буйнейшая у Еўропе моўная супольнасць (300-350 млн. чалавек)

# СУБЭТНАСЫ БЕЛАРУСКАГА ЭТНАСУ

- Л І Т В І Н Ы
- П А Л Е Ш У К І
- Б Е Л А Р У С Ы

**Этнічная група (дыяспара, нацыянальная меньшасць) –**
частка этнасу, якая пражывае на тэрыторыі іншага этнасу альбо ў іншай краіне.

Усяго ў свеце пражывае каля 11 млн. беларусаў, у тым ліку ў замежжы ( беларускія дыяспары) каля 3,5 млн.

# Асноўныя канцэпцыі ўтварэння БЕЛАРУСКАГА ЭТНАСУ

- **ФІНСКАЯ** ( пісьменнік Іван Ласкоў);
- **БАЛЦКАЯ** (Валянцін Сядоў);
- **КРЫВІЦКАЯ** (Вацлаў Ластоўскі, М. Пагодзін);
- **КРЫВІЦКА-РАДЗІМІЦКА-ДРЫГАВІЦКАЯ** (Яфім Карскі, Уладзімір Пічэта, Мітрафан Доўнар-Запольскі, Міхаіл Грынблат);
- **СТАРАЖЫТНАРУСКАЯ** (афіцыйная ў савецкі час);
- **ПОЛЬСКАЯ** (Аляксандр Рыпіньскі, Л. Галембоўскі);
- **ВЯЛІКАРУСКАЯ** (праф. А. Сабалеўскі і І. Сразнеўскі);
- **НОВАЯ** (этнограф С. Токараў);
- **КАНЦЭПЦЫЯ Міколы Ермаловіча**;
- **СУЧАСНАЯ** (Акадэміі Навук РБ – Міх. Піліпенка і інш.).

# ПЕРЫЯДЫЗАЦЫЯ ЭТНІЧНАЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСАЎ

## (У ЯЕ АСНОВЕ – ПРЦЭСЫ ФАРМІРАВАННЯ БЕЛАРУСКАГА ЭТАСУ, ЯГО АНТРАПАЛАГІЧНЫХ, МОЎНЫХ, КУЛЬТУРНА-БЫТАВЫХ АСАБЛІВАСЦЕЙ)

| | |
|---|---|
| • **Даіндаеўрапейская эпоха** (супадае з каменным векам) | 100-40 тыс.гг.да н.э. – рубеж III-II тыс.да н.э. |
| • **Індаеўрапейская эпоха** | рубеж III-II тыс.да н.э. – да сучаснасці. |
| **<u>Балцкі перыяд</u>** | рубеж III-II тыс. да н.э. – 3 ст. да н.э. |
| **<u>Славянскае засяленне</u>** тры патокі: | 3 ст. да н.э. – 8 ст. н.э.<br>1) 400-200 гг. да н.э.(на Палессе-”паморская культура”)<br>2) 3 – 5 ст. н.э.<br>3) 6- 8 ст. н.э. (па ўсёй тэрыторыі Беларусі) |
| **<u>Усходнеславянскі перыяд</u>** (утварэнне 12 супольнасцей на Русі) | 9 – 13 ст. |
| **<u>Завяршенне фарміравання беларусаў як энаса</u> (народа)** | 13- сяр. 16 ст. |
| **<u>Беларускі этнас у складзе федэрацыі Рэч Паспалітая</u>** (паланізацыя, лацінізацыя) | 2-я пал.16- канец 18 ст. |
| **<u>Беларускі этнас у складзе Расіі</u>** (русіфікацыя) | канец 18 ст. – 1917 г. |
| **<u>Беларускі этнас у складзе СССР</u>** | 1922 – 1991 гг. |
| **<u>Беларускі этнас у самастойнай дзяржаве РБ</u>** | з 1991 года па сучаснасць |